www.dreamgrow.com/48-social-media-kpis-key-performance-indicators. – Дата доступа: 20.01.2017.
3. Seiter, C. 30 Social Media Metrics that Prove Real Value [Электронный ресурс] / C. Seiter // Raventools.com. – Режим доступа: http://media.raventools.com/raven-tools-social-metrics.pdf. – Дата доступа: 20.01.2017.
4. Халилов, Д. Маркетинг в социальных сетях / Д. Халилов. – М.: Манн, Иванов и Фербер, 2013. – 240 с.
5. Рай, А. Эксперт-опрос: Как считают эффективность SMM [Электронный ресурс] / А. Рай // Нетология. – Режим доступа: http://netology.ru/blog/ekspert-opros-kpi-v-rossiyskom-smm. – Дата доступа: 20.01.2017.
6. Волкова, Ю. Метрики JagaJam для измерения эффективности в SMM: активность, вовлеченностсь, ядра пользователей [Электронный ресурс] / Ю. Волкова // Cossa.ru. – Режим доступа: http://www.cossa.ru/152/91387. – Дата доступа: 20.01.2017.
7. Какие KPI используются в SMM [Электронный ресурс] // Madcats.ru. – Режим доступа: http://madcats.ru/smm/smm-izmerenie-kpi. – Дата доступа: 20.01.2017.
8. Rayson, S. Content, Shares, and Links: Insights from Analyzing 1 Million Articles [Электронный ресурс] / S. Rayson // Moz.com. – Режим доступа: https://moz.com/blog/content-shares-and-links-insights-from-analyzing-1-million-articles. – Дата доступа: 20.01.2017.
9. Амзин, А. Как новые медиа изменили журналистику. 2012–2016 / А. Амзин, А. Галустян, В. Гатов [и др.]; под науч. ред. С. Балмаевой и М. Лукиной. – Екатеринбург: Гуманитарный университет, 2016. – 304 с.

**Уладзімір Субат**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## АЎТАРСКІЯ РУБРЫКІ Ў ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯХ АБ’ЯДНАНАЙ РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ»

Адно з самых аўтарытэтных дзяржаўных друкаваных перыядычных выданняў у Рэспубліцы Беларусь – газета «Советская Белоруссия» («СБ. Беларусь Сегодня»), тыраж якой перавышае 400 тысяч экзэмпляраў. З другой паловы 2013 года ў састаў аб’яднанай рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» ўвайшлі рэдакцыі газет «Рэспубліка», «Народная газета», «Белорусская нива» (с 2014 г. – «Сельская газета») і «Знамя юности». Таксама аб’яднанай рэдакцыяй выдаюцца «Журнал специального назначения» і часопіс «Беларусь. Belarus», газета «The Minsk Times» (з дапаўненнем «Голас Радзімы»). Рэалізуюцца сумесныя праекты «Союз» (разам з «Российской газетой», РФ), «Беларусь

Сегодня» (разам з газетай «Литовский курьер», Літоўская Рэспубліка) і «Союзное вече» – перыядычнае выданне Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Мова выданняў – руская, беларуская (газета «The Minsk Times» – англійская, часопіс «Беларусь. Belarus» – беларуская, англійская, польская, іспанская).

У адпаведнасці з даручэннем Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у аб'яднанай рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия», пачынаючы з 2014 года, адбыліся кардынальныя змяненні, звязаныя з выпускам сродкаў масавай інфармацыі, заснавальнікам якіх з'яўляецца рэдакцыя. У ліку гэтых пераўтварэнняў– змяненне фармата і перыядычнасці асобных выданняў. Газеты «СБ. Беларусь сегодня» і «Рэспубліка» выходзяць пяць разоў на тыдзень, тройчы – «Сельская газета». Штотыднёвікамі сталі «Народная газета», «Знамя Юности» і «The Minsk Times» («Голас Радзімы»). Часопісы «Беларусь. Belarus» і «Журнал Специального Назначения» выходзяць штомесячна. Змяніўся фармат газеты «Рэспубліка».

Заўважна аднавіўся дызайн і падача матэрыялаў у перыядычных выданнях аб'яднанай рэдакцыі. З'явіліся пастаянныя аўтарскія рубрыкі, калонкі, нават старонкі. Так у газеце «СБ. Беларусь Сегодня» пастаяннымі сталі старонкі "Люди и время" вачамі журналіста Леаніда Екеля, калонкі «Непророк» Аляксандра Кулінковіча, «Личное» Уладзіміра Сцепаненкі, «Живой звук» Юліі Андрэевай, «Глазами художника» і «Есть вопрос» Алега Карповіча, "Кочка зрения" Сяргея Канашыца, "Кінадом" Людмілы Саянковай, сумесны праект "СБ" і Дзяржаўнага памежнага камітэта. Свае калонкі маюць у "Народной газете" журналісты Таццяна Сулімава, Інэса Плескачэўская, Валянцін Пепяляеў, Наталля Невідомая, Вольга Бябеніна, Людміла Канапелька, Яўген Канановіч, а ў "Рэспубліцы" – часта выдаюць свае калонкі Міхась Валькоўскі, Андрэй Лемяшонак, Мікалай Дубовік, Аляксей Кітнеў, Алена Бегунова і іншыя вядучыя журналісты выданняў, якія перыядычна выказваюць свае меркаванні на злабадзённую тэму. Такая форма падачы газетнага матэрыялу бярэ пачатак яшчэ з XVII стагоддзя, калі з распаўсюджваннем газет паўстала пытанне пра іх акупаемасць. Каб знізіць іх кошт, тэкст друкаваўся дробным шрыфтам. Чытаць такі тэкст было цяжкавата, і таму яго разбівалі на слупкі, і пры гэтым матэрыял не сістэматызавалі. Паступова раздзяленне тэксту на слупкі стала больш асэнсаваным. Калонкі сталі спосабам арганізацыі матэрыялу на паласе.

З пачатку мінулага стагоддзя больш актыўна сталі выкарыстоўвацца аўтарскія калонкі на найбольш актуальныя тэмы і паступова фарміравацца

жанры. Склалася практыка публікаваць пад рубрыкай "калонка" тэксты, якія больш схільны да жанраў з уплывовым аўтарскім пачаткам (эсэ, каментарый, агляд). З гэтага корпуса вызначылася група матэрыялаў, яўна падобных паміж сабою, і ў той жа час яны не падыходзілі ні пад адзін традыцыйны жанр, але былі аб'яднаны такой формай – калонкай, дзе ёсць магчымасць журналісту выказаць сваю пазіцыю, суб'ектыўную думку. Папулярнай стала яна ў перыядычным друку, адціснуўшы на другі план нарысы, праблемныя матэрыялы, эсэ, фельетоны і іншыя газетныя жанры. Паступова метад вылучэння матэрыялу на газетнай паласе пашырыў памеры калонкі да асобнай газетнай паласы.

Пяты год запар у газеце "Белорусская нива" (з 2015 года "Сельская газета") бесперапынна штосуботы выходзіць аўтарская старонка гаспадара гэтых друкаваных радкоў, якая атрымала назву "Вытокі з Уладзімірам Субатам". У матэрыялах рубрыкі расказваецца пра асоб розных прафесій і заняткаў з розных куткоў Беларусі. Яны шчыра распавядаюць пра свае радаслоўныя карані, працоўныя поспехі і захапленні, дзеляцца прафесійным вопытам, выказваюць меркаванні па найбольш актуальных патыннях сучаснага грамадства. Кожная з такіх гісторый па-свойму цікавая і захапляльная і вартая ўшанавання.

Герой Беларусі Васіль Равяка два дзесяцігоддзі кіруе перадавой гродзенскай гаспадаркай "Прагрэс"-Верцялішкі", а пачынаў сваю хлебаробскую дзейнасць з ельскай гаспадаркі "Дабрынь". Па суседству моцна трымае штурвал кіраўніка СВК "Кастрычнік-Гродна" Віталь Крамко, сын легендарнага старшыні гэтай гаспадаркі Героя Беларусі Віталя Ільіча Крамко, якому на плошчы гродзенскай вёскі Квасоўка ўстаноўлены бюст. Слынныя беларускія аграрыі Героі Сацыялістычнай Працы Васіль Гарошка, Алег Валадзько, сённяшнія кіраўнікі перадавых вытворчых сельгаскалектываў Мікалай Радаман, Рыгор Шпакаў, Юрый Мароз, Аляксей Дзямко, Міхаіл Страпко, Аляксей Мікуліч, Валянцін Карпаў, Васіль Акуліч, а таксама руплівыя фермеры Уладзімір Адамовіч, Уладзімір Навіцкі, Васіль Ціхіня, Андрэй Дарняк, Міхаіл Шруб. Але не толькі беларускія аграрыі – героі гэтай суботняй рубрыкі галоўнай аграрнай газеты нашай краіны. Аўтар знаёміць чытачоў і з прадстаўнікамі іншых сфер дзейнасці. Героямі публікацый сталі рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта акадэмік Сяргей Абламейка, кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага хору імя Г.І. Цітовіча, прафесар Міхаіл Дрынеўскі, прафесар Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Марк Фрэйдзін, народны скульптар Беларусі Леў Гумілеўскі,

дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір Пракапцоў, народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч, пісьменнік Мікола Мятліцкі, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Яны распавядаюць пра свае вытокі і жыццёвыя сцяжыны. Газетныя матэрыялы гэтай рубрыкі мацуюць каштоўнасныя асновы журналістыкі. Гэтай праблемай параўнальна нядаўна зацікавіліся навуковыя даследчыкі. Прафесар В. Сідараў ў аб'яднаным зборніку, выдадзеным Інстытутам "Вышэйшая школа журналістыкі і масавых камунікацый" Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта вызначыў найбольш важныя пытанні каштоўнасных пераваг і прачытанняў журналістыкі. Асэнсаваннем спецыфікі сучаснай нацыянальнай медыяпрасторы займаюцца і беларускія навукоўцы. Аксіялагічны аналіз сучаснай журналістыкі дае магчымасць больш глыбока і шматгранна вызначыць адлюстраванне ў перыядычных выданнях, як і ў электронных сродках масавай інфармацыі, каштоўнасных прыярытэтаў грамадства. Вядомае гістарычнае выказванне "Не хлебам адзіным..." падкрэслівае багацейшую палітру журналістыкі. У газетных артыкулах пра выбітных асоб зямлі беларускай акрамя прафесійных поспехаў кожнай асобы адлюстроўваюцца іх маральна-этычныя прыярытэты. Такія матэрыялы абавязкова дапаўняюцца дакументальнымі фотаздымкамі, на якіх адлюстраваны героі ў розныя гады жыцця.

Апублікавана звыш двухсот арыгінальных артыкулаў пад агульнай рубрыкай "Вытокі з Уладзімірам Субатам", якія самі па сабе сталі гістарычнымі дакументамі адлюстравання эпохі, і маюць пэўнае значэнне ў аб'ектыўна-анталагічным сэнсе. Як адзначае у сваёй навуковай працы кандыдат гістарычных навук Таццяна Падаляк "каштоўнасныя ўстаноўкі супрацоўнікаў СМІ вызначаюць формы, спосабы, ракурс бачання даследуемай сітуацыі, з'явы, праблемы, а значыць, непасрэдна ўздзейнічаюць на аб'ектыўнасць, праўдзівасць, непрадузятасць адлюстравання рэчаіснасці – галоўныя творчыя арыенціры журналісцкай дзейнасці". Менавіта такімі арыенцірамі і карыстаецца ў сваёй творчай дзенасці аўтар газетнай старонкі "Вытокі з Уладзімірам Субатам". Выдавецкі дом "Звязда" па заказу і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь падрыхтаваў і ў 2016 годзе выдаў кнігу "Вытокі". Аснову гэтага зборніка і склалі найбольш яркія матэрыялы газетнай рубрыкі.